# ТЭКСТ. ПЛАН ТЭКСТУ

**Тэкст** — выказванне, у якім некалькі сказаў звязаны паміж сабой па сэнсе.

**Тэма тэксту** — тое, пра што гаворыцца ў тэксце.

**Асноўная думка тэксту** — гэта галоўнае, што аўтар хоча сказаць чытачу.

**Рэпка**

Пасадзіў дзед рэпку. Вырасла рэпка вялікая-прывялікая. Стаў дзед цягнуць рэпку... І выцягнулі рэпку.

***Тэма*** казкі: як дзед з памочнікамі выцягнуў вялікую рэпку. ***Асноўная думка*** казкі: сяброўства заўсёды дапамагае ў розных справах.

**Загаловак** — гэта назва тэксту.

Тэкст заўсёды павінен мець **пачатак, асноўную частку** і **канцоўку. У плане тэксту** адлюстроўваецца змест і будова тэксту.

Каб скласці план, трэба:

1) падзяліць тэкст на сэнсавыя часткі;
2) вызначыць тэму кожнай сэнсавай часткі;
3) запісаць тэмы сэнсавых частак, як пункты плана. План можа таксама складацца з пытанняў да кожнай сэнсавай часткі тэксту.

Сярожа і Алёша пайшлі ў лес па ягады. Раптам да хлопчыкаў даляцеў пах дыму. Гарэла сухое ламачча.

Хлопчыкі пайшлі на месца пажару. Полымя паўзло па сухім верасе. Дзеці пачалі засыпаць агонь пяском. Ад дыму слязіліся вочы.

Але хлопчыкі не адступалі. Неўзабаве пажар быў патушаны.

**План (I)**

1. Пажар у лесе.
2. Барацьба з агнём.
3. Не адступілі.

**План (II)**

1. Што ўбачылі хлопчыкі?
2. Як яны змагаліся з агнём?
3. Ці перамаглі хлопчыкі агонь?

**1.** Параўнайце, калі ласка, дзве групы сказаў. Адзначце галачкай, якая група сказаў з'яўляецца тэкстам.

☐ Быў сонечны дзень. Ясь і Яніна ўзялі кошыкі і пайшлі ў лес. Тут было шмат грыбоў. Дзеці збіралі баравікі і лісічкі. Калі вярнуліся дамоў, пажарылі грыбочкі з цыбуляй. Атрымалася смачная вячэра!

☐ Быў сонечны дзень. Андрэйка глядзеў у акно. Там жыве мядзведзь. На паліцы было шмат кніг. Дзеці з задавальненнем з'елі торт. У траве скачуць зялёныя конікі.

**2.** Падзяліце, калі ласка, тэкст на сказы. Расстаўце знакі прыпынку. Успомніце, з якой літары пачынаецца кожны сказ.

Прыйшла доўгачаканая вясна дні сталі даўжэйшымі, а ночы карацейшымі на лясной прагалінцы з'явіліся прыгожыя пралескі на лузе зацвілі дзьмухаўцы прыляцелі з выраю першыя птушкі яны спяваюць пра надыход чароўнай пары года.

**3.** Выберыце і падкрэсліце, калі ласка, загаловак, які найбольш адпавядае папярэдняму тэксту.

а) Забавы;
б) Прырода;
в) Вясна;
г) Гульні;
д) Дачакаліся.

**4.** Прачытайце. Выберыце, калі ласка, у дужках патрэбную літару, непатрэбную закрэсліце. Падзяліце тэкст на сказы, запішыце. Пасля гэтага прыдумайце, калі ласка, загаловак і запішыце яго перад тэкстам.

Восе(н, нн)ю я люблю ха(д, дз)і(т, ц)ь (у, ў) ле(с, з) па гры(б, п)кі там высокія хвоі развесілі іглістыя в(е, я)рхавіны елачкі выгінаю(т, ц)ь к(а, о)лючыя галінкі к(о, а)ранастыя ду(б, п)кі цягну(ц, цц)а да сонейка красую(тц, цц)а кучаравыя б(е, я)ро(з, с)кі дрыжа(т, ц)ь кволыя асінкі а навокал такі водар і прыгажос(т, ц)ь!

**5.** Прачытайце, калі ласка, сказы. Устаўце прапушчаныя літары. Лічбамі абазначце парадак сказаў так, каб атрымаўся пэўны тэкст. Прыдумайце, калі ласка, і запішыце да тэксту загаловак.

______________________________

☐ У моцныя мар__зы яны часта гіну__ь без еж__.

☐ Сё___я на __року Зоя Іосіфа__на расказала вучням пра жы___ё птушак узімк__.

☐ Чалавек павінен дапам__ га__ ь слабейш__м істотам.

☐ І пасля __рока__ ___е__і выраш__лі падк__рмі__ь л__сных птушак.

☐ Увес__ кла__ слуха__ вел__мі __важліва.

- Падкрэсліце, калі ласка, сказ, у якім выражаецца асноўная думка.

**6.** Адкажыце, калі ласка, на пытанні так, каб атрымаўся тэкст. Выберыце з дужак тое, што падыходзіць па сэнсе. Запішыце тэкст. Прыдумайце да яго загаловак.

- Якая пара года наступіла пасля лета? (*зіма, вясна, восень*)
- Якія стаяць дрэвы? (*зялёныя, жоўтыя, чырвоныя, блакітныя, прыгожыя, рознакаляровыя, разгалістыя*)
- Што робяць птушкі? (*співаюць песні, адлятаюць у вырай, будуюць гнёзды, высіджваюць птушанят, лётаюць, адпачываюць, палохаюцца*)

- Чым займаецца вавёрка? (*рыхтуе запасы на зіму, збірае арэхі, сядзіць, глядзіць, збірае лісце, сушыць грыбы, высцілае дупла сухой травой і поўсцю*)
- А што робяць вожык, барсук і мядзведзь? *(гуляюць, рыхтуюць запасы, адпачываюць, шмат ядуць, упадаюць у спячку*)

## *Праверце сябе!*

По апорных словах вусна складзіце, калі ласка, тэкст на тэму:

### Школа

***Словы для даведкі***: скончыліся вясёлыя канікулы, ідуць у школу, сустракае настаўніца і школьныя сябры (сяброўкі), успамінаюць правілы, пішуць і чытаюць, рашаюць прыклады і задачы, дапамагаюць, на перапынках, пасля ўрокаў, дамашняе заданне, шчаслівае набыццё ведаў.

Мая адзнака

# ЗМЕСТ

Тэкст. План тэксту . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 1

Сказ. Тыпы сказаў: апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя сказы. Клічныя сказы . . . . . . . . . . . 6

Дзейнік і выказнік — галоўныя члены сказа . . . . . . 12

Даданыя члены сказа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17

Слова. Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнне слоў . . . . . . . . . . . . . . . . 22

Сінонімы. Антонімы. Словы, аднолькавыя па гучанні, але розныя па значэнні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28

Склад слова. Роднасныя (аднакаранёвыя) словы. Корань слова, змены гукаў у каранях слоў . . . . . . . . . 33

Формы слова. Канчатак. Нулявы канчатак . . . . . . . . 39

Прыстаўка. Правапіс прыставак *аб-, ад-, на-, над-, пад-, прад-, пры-, перад-, вы-*. Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на *з-(с-): уз- (ус-), з-(с-), раз-(рас-), без-(бес-)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 43

Падваенне зычных на стыку прыстаўкі і кораня. Апостраф у словах з прыстаўкамі. Напісанне прыставак і прыназоўнікаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48

Суфікс. Падваенне зычных на стыку кораня і суфікса . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52

Агульнае паняцце пра службовыя часціны мовы: прыназоўнікі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56

Агульнае паняцце пра самастойныя часціны мовы: назоўнікі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 61

Агульнае паняцце пра самастойныя часціны мовы: прыметнікі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66

Агульнае паняцце пра самастойныя часціны мовы: дзеясловы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 70

*Літаратура* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 76

УДК 372.811.116.13.046.12
ББК 74.268.12Беи
К78

**Красуцкая, Н. А.**
К78 Мова паспяхова. Сшытак-трэнажор па беларускай мове. 3 клас : дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі / Н. А. Красуцкая. — Мазыр : Выснова, 2021. — 76 с. : іл.
ISBN 978-985-27-1041-1.

Дапаможнік змяшчае ўсе тэмы вучэбнай праграмы па беларускай мове для 3 класа і будзе карысны пры замацаванні атрыманых ведаў на ўроку і адпрацоўцы арфаграфічных навыкаў. Работа над кожнай тэмай уключае тэорыю (правіла), трэніровачныя заданні і заданні на праверку ўменняў і навыкаў. Выніковыя заданні дапамогуць вучню самому ацаніць свае дасягненні ў межах кожнай тэмы.

Прызначаецца настаўнікам пачатковых класаў.

**УДК 372.811.116.13.046.12**
**ББК 74.268.12Беи**